ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

| | |
|---|---|
| 1 месяц | 30 кап. |
| 3 месяцы | 90 " |
| 6 месяцаў | 1 р. 80 " |
| 1 год | 3 р. 30 " |

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

№ 265 (934) | ПЯТНІЦА, 22-га лістапада 1929 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

## II СЭСІЯ ЦВК БССР IX СКЛІКАНЬНЯ

# МЫ БУДУЕМ І ПАБУДУЕМ СОЦЫЯЛІЗМ

*(З уступнай прамовы т. Чарвякова)*

Тав. ЧАРВЯКОЎ, адчыняючы Сэсію у сваёй уступнай прамове сказаў.

— Ужо 12 год ідзе бязьлітасная барацьба двух начал: соцыялістычнага і капіталістычнага. У гэтай барацьбе Савецкая Беларусь, як частка Савецкага Саюзу, займае пачэснае месца. Год за годам у барацьбе за перамогу соцыялізму Савецкая Беларусь дасягае ўсё новых і новых посьпехаў. Апошні год соцыялістычнага будаўніцтва даў асабліва значныя вынікі ў параўнаньні з мінулымі гадамі.

Гэты год быў першым годам пяцігадовага пляну соцыялістычнага будаўніцтва гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі. Пяцігадовы плян, як вядома, быў вызначаны з вялікім і значным напружаньнем усіх сродкаў нашай краіны. Ня гледзячы на гэта, мы ў першым-жа годзе выкананьня пяцігодкі значна апярэдзілі тыя кантрольныя лічбы, што былі вызначаны на гэты год.

Шпаркі тэмп прамысловасьці ўсё больш павялічвае ролю прамысловасьці ў народнай гаспадарцы, надае прамысловасьці кіруючую ролю ў народнай гаспадарцы, павялічвае колькасьць пролетарыяту ў БССР, павялічвае таксама політычную ўдзельную вагу пролетарыяту ў соцыялістычным будаўніцтве.

Як вынік посьпехаў будаўніцтва ў галіне прамысловасьці Савецкая Беларусь ужо ператварылася з краіны аграрнай у краіну аграрна-прамысловую і ідзе далей па шляху яе ператварэньня ў краіну прамысловую, кулацкіх і нэпманскіх контррэволюцыйных элемэнтаў супроць мерапрыемстваў савецкае ўлады і Компартыі.

У Савецкай Беларусі барацьба капіталістычных элемэнтаў супроць соцыялістычнага будаўніцтва атрымоўвае асаблівую форму ў якасьці нацыяналізму і асабліва ў якасьці правядзеньня беларускага нацыянал-дэмократызму.

Вельмі часта здараецца так, што тыя комуністы, якія пастаўлены ў савецкіх установах і грамадзкіх організацыях, дзеля таго, каб там забясьпечваць правядзеньне ўсіх мерапрыемстваў соцыялістычнага будаўніцтва, каб там забяспечваць чыстату клясавай лініі, самі падпадаюць пад уплывы нацыянал-дэмократычных элемэнтаў і ператвараюцца ў рупар, праз які нацыянал-дэмократычныя элемэнты выказваюць свае [illegible], праводзяць свае ўплывы, ухіляюць працу нашых установ на карысьць узмацненьня капіталістычных элемэнтаў, замест таго, каб садзейнічаць далейшаму разгортваньню і ўзмацненьню элемэнтаў соцыялізму.

Аднак, у гэтай барацьбе перамагае соцыялістычнае будаўніцтва. І гэтая перамога дасягаецца намі дзякуючы таму, што НА ЧАЛЕ ЎСЯГО СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА СТАІЦЬ ЛЕНІНСКАЯ КОМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, ЯКАЯ АБ'ЯДНАЕ НАВАКОЛ СЯБЕ РАБОЧУЮ КЛЯСУ БЕЛАРУСІ, ШТО ПАД ШТАНДАРАМІ КОМПАРТЫІ РАБОЧАЯ КЛЯСА зьдзейсьнівае ўсе мерапрыемствы да ідэолёгаў правага ўхілу. ГЭТЫЯ ПАСТАНОВЫ ВЫНЕСЕНЫ ЦЭНТРАЛЬНЫМ КАМІТЭТАМ НА ПАДСТАВЕ ПАТРАБАВАНЬНЯЎ З БОКУ ЎСЯЕ ПАРТЫІ ДЗЕЛЯ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ЛЕНІНСКАЙ ЧЫСТАТЫ ПАРТЫІ.

Таварышы! Чым далей уперад мы ідзем, тым усё больш і больш складанымі становяцца тыя задачы, што нам прыходзіцца вырашаць. Аднак, чым большыя задачы соцыялістычнага будаўніцтва мы вырашаем, тым больш павялічваюцца тыя тэмпы, з якімі мы павінны ісьці ўперад для канчатковай перамогі соцыялізму.

Тое, што ўчора яшчэ здавалася нам недасягаемым, сёньня становіцца рэчаістасьцю. Тое, што ўчора яшчэ здавалася нам максымумам, сёньня становіцца мінімум.

Вось гэты тэмп нясупыннага руху ўперад патрабуе таго, каб кожны з нас умеў пераключыцца, каб пасьпяваць за гэтымі тэмпамі будаўніцтва.

Няўменьне пераключыцца на новыя тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва—ёсьць прычына таго, што жыцьцё адкідае тых, хто ня можа ісьці нага ў нагу ў соцыялістычным будаўніцтве, хто ня мае ў сябе сіл і здольнасьцяў дзеля таго, каб стаць на чале гэтых моцных тэмпаў далейшага разгортваньня перамагаючага соцыялізму.

Але на зьмену тым, хто траціць сілы ў процэсе будаўніцтва, на зьмену тым, хто траціць веру ў перамогу канчатковага соцыялізму на зьмену тым, хто баіцца гэтых

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы